# СВЯТЛАНА РУМЯНЦАВА: «НЕ БОЙЦЕСЯ РАСЦІ ПАВОЛЬНА, БОЙЦЕСЯ ЗАСТАВАЦЦА НЯЗМЕННЫМІ»



Напрыканцы верасня ў Мінску былі аб'яўлены пераможцы рэспубліканска-га конкурсу прафесійнага майстэрства «Настаўнік года – 2017». У спаборніцтве прынялі ўдзел настаўнікі з усёй Беларусі, да фіналу дайшлі 56 чалавек – па 8 ад кожнай вобласці і Мінска.

Затым былі вызначаны 8 пераможцаў у кожнай намінацыі, якія і змагаліся за званне «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь» ў суперфінале. Што надзвычай прыемна, пераможцай конкурсу стала выпускніца нашага ўніверсітэта, настаўніца беларускай мовы і літаратуры Баравухскай сярэдняй школы №15 горада Наваполацка Святлана Румянцава.

Сёння Святлана Леанідаўна – госць нашай рэдакцыі.

**Інтэрв'ю з С.Л. Румянцавай чытайце на 3-й стар.**

# СВЯТЛАНА РУМЯНЦАВА: «НЕ БОЙЦЕСЯ РАСЦІ ПАВОЛЬНА, БОЙЦЕСЯ ЗАСТАВАЦЦА НЯЗМЕННЫМІ»

**– Святлана Леанідаўна, напачатку дазвольце павіншаваць Вас з заслужанай перамогай. Гэта вельмі ганарова, што на такім прэстыжным конкурсе перамагла прадстаўніца Віцебскай вобласці, выпускніца нашага ўніверсітэта і (упершыню!) настаўніца беларускай мовы і літаратуры. Скажыце, калі ласка, чаму Вы абралі менавіта гэтую прафесію?**

– Дзякую за віншаванні. Чаму я вырашыла стаць настаўніцай беларускай мовы і літаратуры? Справа ў тым, што маё школьнае жыццё было насычанае, багатае на падзеі, цікавыя сустрэчы, падарожжы. Але заўсёды знаходзілася вольная часінка, каб пабыць разам са сваім любімым спадарожнікам – кнігай. З маленства любімым заняткам для мяне было чытанне, таму сваю будучую прафесію звязвала менавіта са Словам, без якога не ўяўляла свайго жыцця. Любоў да беларускага слова таксама з дзяцінства – ад бабулі, матулі, маіх дарагіх настаўнікаў.

**– Вы ў свой час скончылі наш універсітэт. Што найбольш запомнілася са студэнцкіх гадоў і хто з выкладчыкаў здолеў зацікавіць сваёй дысцыплінай?**

– Я вучылася ў Віцебскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя С.М. Кірава з 1988 па 1993 год. Праўда, на апошнім пятым курсе мы, студэнты, не толькі вучыліся, але і працавалі.

У той час у Віцебскай вобласці не хапала настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, таму выпускнікі 54-й і 55-й груп былі накіраваны па размеркаванні ў розныя мястэчкі і гарады Віцебшчыны.

Студэнцкія гады, безумоўна, забыць немагчыма. Гэта і шчырае сяброўства, і бяссонныя ночы за кнігамі, і першыя крокі да прафесіі. Запомніліся мне і заняткі з любімымі выкладчыкамі, і вечары ў інтэрнаце № 3, і праца на палях Талачынскага раёна, і атмасфера Віцебска – горада майго юнацтва. Гэта былі гады, напоўненыя святлом ведаў, сяброўства, кахання.

А нашыя выкладчыкі! Яны зацікавілі сваім прадметам не адно пакаленне студэнтаў і запалілі агеньчык любові і адданасці беларускай мове і літаратуры і ў маёй душы. Педагагічнае майстэрства, глыбокае веданне сваёй дысцыпліны, розум, маральная высакароднасць, душэўная прыгажосць, незаспакоенасць – усім гэтым надзелены мае выкладчыкі.

З павагай і цеплынёй я ўспамінаю Г.А. Арцямёнка (ён быў куратарам нашай групы), В.І. Несцяровіча (загадчыка кафедры), А.М. Канапельку, Л.С. Васюковіч, В.І. Русілка, В.Ю. Бароўка, Ю.У. Маханькова, Л.І. Злобін, Я.Н. Марозаву, В.В. Здольнікава, выкладчыцу педагогікі І.Я. Кернажыцкую. На старшых курсах да нас прыйшлі маладыя выкладчыкі Г.К. Семянькова, А.С. Дзядова, Ю.М. Бабіч. Усіх іх мы ўспамінаем і сёння.





**– Цікава, а зараз Вы падтрымліваеце стасункі са сваімі былымі выкладчыкамі і аднакурснікамі?**

– Як член журы абласной алімпіяды па беларускай мове і літаратуры, я маю цудоўную магчымасць сустракацца з некаторымі выкладчыкамі. Але, на жаль, многіх не бачыла са студэнцкіх гадоў.

Прыемна, што педагогіку ў маёй дачкі Дзіяны, сёння студэнткі пятага курса філалагічнага факультэта любімай альма-матар, выкладала таксама І.Я. Кернажыцкая, а замежную літаратуру на першым курсе – В.В. Здольнікаў.

Агульную сустрэчу з аднакурснікамі наладжвалі толькі адзін раз. Гэта было незабыўна!

Зараз стараемся падтрымліваць сувязь праз «Аднакласнікі», каб не згубіцца ў часе і на адлегласці. З некаторымі дзяўчаткамі: Юпат (Кісялёвай) Ганнай, Паметнікавай (Маслоўскай) Лёляй, Зайцавай (Селюценка) Ларысай, Полесавай (Салаўёвай) Дзінай – тэлефануемся. Часта сустракаю Ірыну Арлову, Алену Вашыла (Баравік), Алену Быкаву (Сушко). Многіх аднакурсніц бачу на курсах павышэння кваліфікацыі, калі праводжу метадычныя заняткі ў Віцебскім абласным інстытуце развіцця адукацыі, або сустракаю падчас абласных метадычных саветаў.

Здараюцца і зусім выпадковыя сустрэчы. Напрыклад, Вольгу Хандогіну (Данусевіч) не бачыла 24 гады, а сустрэла ў жніўні на нарадзе ў Мінску. Нашай радасці не было межаў!

**– Што падштурхнула прыняць удзел у конкурсе «Настаўнік года» і ці верылі Вы ў перамогу?**

– Калі я паспяхова здала экзамен на кваліфікацыйную катэгорыю «настаўнік-метадыст», адзіная прапанова, якая мне была выказана членамі атэстацыйнай камісіі, датычылася ўдзелу ў прафесійных конкурсах. А ў школе адміністрацыя прасіла паспрабаваць.

Шчыра кажучы, няпроста мне было прыняць рашэнне ўдзельнічаць у конкурсе. Па-першае, любы конкурс – гэта і сумненні, і хваляванне, і недахоп часу. Па-другое, падрыхтоўка на ўсіх этапах конкурсу была вельмі сур'ёзнай. Па-трэцяе, трэба ж было выконваць і свае прамыя абавязкі ў школе.

Адна я не змагла б гэта ўсё пераадолець, таму шчыра дзякую за дапамогу адміністрацыі школы, маім калегам і сябрам, Віцебскаму інстытуту развіцця адукацыі.

Канешне, пра абсалютную перамогу я нават не марыла. Хацелася як мага лепш выступіць у сваёй намінацыі «Руская мова і літаратура. Беларуская мова і літаратура».

Выхад у суперфінал быў няпростым: усе мае калегі – таленавітыя, творчыя, разумныя людзі, сапраўдныя прафесіяналы. Спачатку я была на другім месцы. Але я па натуры змагар і не магла дазволіць сабе пасаваць перад складанасцямі. Нягледзячы на тое, што лёгкае хваляванне ўсё ж было, у суперфінале я атрымлівала задавальненне ад кантактаў з калегамі, з прысутнымі ў зале АПА.

**– Вы атрымалі ганаровае званне «Настаўнік года» таму, што...**

– Я цвёрда ўпэўнена: у гэтым конкурсе няма пераможаных. Усе, хто дайшоў да фіналу, хто толькі спрабаваў сябе на раённым ці абласным этапе, ужо пераможцы. Бо ўсе гэтыя настаўнікі цяпло сваёй душы, свае веды аддаюць дзецям.

Наконт маёй перамогі, думаю, можна вызеліць некалькі прычын, якія яе абумовілі.

Па-першае, я вельмі люблю сваю справу. Для мяне яна самая высакародная і ўнікальная.

Па-другое, я шмат працую над сабой, вучуся новаму, імкнуся да самаўдасканалення. Мне вельмі падабаецца прыказка: не бойцеся расці павольна, бойцеся заставацца нязменнымі. А маё жыццёвае крэда гучыць так: дарогу адолее той, хто ідзе. Вось я і стараюся не спыняцца.

Па-трэцяе, у мяне была апора і падтрымка: калегі, сябры, аднадумцы.

І галоўнае – я старалася быць самой сабой, а не падобнай да іншых.

**– Усім вядома, што праца настаўніка адымае шмат часу, якога на сям'ю амаль не застаецца. Як Вам удаецца сумяшчаць працу ў школе і клопат пра сваіх дамачадцаў?**

– Якраз цяпер настаў такі момант, калі больш часу я магу прысвячаць працы без шкоды для сям'і. Мая сям'я – гэта дачка Дзіяна, матуля, сёстры. Матуля і сёстры таксама настаўніцы, жывуць у Расонскім раёне. Дачка вучыцца ў Віцебску, прыязджае на выхадныя. Разумее мяне поўнасцю, бо сама ў хуткім часе пераступіць школьны парог у якасці настаўніцы. Але быў час, калі дачка-сямікласніца крыўдзілася, бо ёй хацелася больш увагі і клопату з майго боку. Гэта было справядліва. Зараз мне балюча пра гэта ўспамінаць, але той год для мяне стаў урокам: родныя людзі таксама маюць патрэбу ў табе, і ні пры якіх абставінах іх нельга абдзяляць.

**– Што самае галоўнае, на Ваш погляд, у працы з дзецьмі?**

– Любоў і павага да кожнай асобы, шчырасць ва ўзаемаадносінах, разуменне дзіцяці, гатоўнасць выслухаць, параіць, прыйсці на дапамогу.

**– Сёння маладым спецыялістам прасцей ці складаней рабіць першыя крокі ў прафесіі?**

– У розныя часы гэта складана. Калі ты прыходзіш у школу пасля ўніверсітэта, ёсць хваляванне, сумненні, цяжкасці. Зараз за кожным маладым педагогам замацаваны вопытны куратар, настаўнік-майстар, таму самае галоўнае – не баяцца і верыць, што ўсё атрымаецца.

Наогул, не магу сказаць, што за 25 год адбыліся нейкія кардынальныя змены ці вучні сталі іншымі. Не, яны заўсёды былі розныя, няўрымслівыя і цікаўныя. Змянілася адно: раней мы вучылі ведам, стараліся даць больш інфармацыі, будавалі ўрокі на традыцыйным падыходзе, зараз вучым думаць, разважаць, самастойна здабываць інфармацыю. Ведаць усё немагчыма, таму трэба ўмець і хацець развівацца, вучыцца ўсё жыццё.

**– Ці даводзілася Вам шкадаваць, што абралі прафесію настаўніка?**

– За гады працы было рознае: радасць і расчараванне, знаходкі і страты, задавальненне ад здзейсненага і бяссонныя ночы. Але заўсёды было адчуванне, што самая высакародная, універсальная, найлепшая прафесія была выбрана мною 29 год назад, калі я паступала ў Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя С.М. Кірава...

Мне ёсць у чым удасканальвацца і ёсць чаму вучыцца. Я не збіраюся спыняцца на дасягнутым. І мне здаецца, мае вучні бачаць прыклад, які пераконвае: трэба расці, шукаць, ствараць, усё жыццё вучыцца, бо гэта абавязковая ўмова гарманічнага развіцця асобы, неад'емная частка жыцця.

**– Дзякуй, што знайшлі час адказаць на нашыя пытанні. Яшчэ раз віншуем з перамогай!**

**Падрыхтавала Алеся ДУБРОЎСКАЯ.**

**На здымках:** *(уверсе)* С.Л. Румянцава *(трэцяя злева ў верхнім радзе)* са сваімі аднагрупніцамі падчас вучобы на першым курсе (1988 год); *(унізе)* Святлана Леанідаўна са сваімі вучнямі.

**Фота з архіва С.Л. Румянцавай.**